ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар ДУК «Баранавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»
_______________Е.В. Кішкевіч

**ПАЛАЖЭННЕ АБ ПРАВЯЗЕННІ ФОТАКОНКУРСУ «ПРАЦЯГВАЮЧЫ ТРАДЫЦЫІ»**

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Дадзенае Палажэнне вызначае мэты і задачы фотаконкурсу "Працягваючы традыцыі" (далей Конкурс);
1.2. Конкурс праводзіцца ў межах праекта "Творчымі сцежкамі Яна Чачота", прысвечанага 230-годдзю са дня нараджэння Яна Чачота;
1.3. Арганізатарам Конкурсу з'яўляецца Цэнтральная раённая бібліятэка імя Яна Чачота.

## 2. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ

2.1. Захаванне культурных і літаратурных традыцый беларускага народа;
2.2. Фарміраванне цікавасці да культурнай спадчыны беларусаў;
2.3. Папулярызацыя літаратурнай творчасці майстроў беларускага слова часоў Яна Чачота;
2.4. Пашырэнне чытацкага кругагляду;
2.5. Развіццё творчага патэнцыялу сярод чытачоў Баранавіцкага раёну.

## 3. ПАРАДАК І УМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

3.1. Конкурс праводзіцца ў перыяд з 1 студзеня па 1 ліпеня 2026 года;
3.2. У Конкурсе прымаюць удзел усе жадаючыя. Колькасць дасланых работ ад аднаго ўдзельніка неабмежавана;
3.3. Фотаздымкі павінны кампазіцыйна адлюстроўваць і ўзнаўляць эпоху часоў Яна Чачота (хатнюю абстаноўку, працу, мастацка абыграныя асобныя прадметы таго часу, касцюмы (пры наяўнасці ў кадры чалавека) і г.д., альбо, па жаданню, увасобіць эпізод з мастацкага твора тых часоў;
3.4. Удзельнікі прадстаўляюць у аддзел маркетынгу, сацыялагічнай дзейнасці і метадычнай работы ЦРБ імя Яна Чачота (электронны адрас metod@rcbsbar.brest.by) матэрыялы ў электронным выглядзе, якія павінны уключаць: непасрэдна сам фотаздымак, яго назву, інфармацыю аб аўтары (фамілія, імя, імя па бацьку,

узрост, населенны пункт, альбо бібліятэку, чытачом якой з'яўляецца);

3.5. Дадатковую інфармацыю аб Конкурсе магчыма атрымаць па тэл.: 80163 64-25-65;

3.6. Вынікі Конкурсу будуць падведзены падчас юбілейнага бенефіса "Нязгасная зорка Чачота", які адбудзецца на базе Цэнтральннай раённай бібліятэкі ў ліпені 2026 года.

## 4. ПАТРАБАВАННІ І КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ

4.1. Фотаздымак павінен мець памер не больш за 500 КБ у фармаце JPEG з максімальна магчымым дазваленнем;

4.2. Фотаздымкі могуць быць як каляровымі, так і чорна-белымі;

4.3. Усе дасланыя на фотаконкурс працы не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца;

4.4. Журы Конкурсу ў складзе дырэктара і супрацоўнікаў аддзела маркетынга, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы ЦРБ імя Яна Чачота ацэньвае майстэрства канкурсантаў па наступных крытэрыях:

- адпаведнасць тэматыцы Конкурса;
- мастацкая і тэхнічная якасць здымка;
- творчасць падыходу да ўвасаблення атмасферы і настрою эпохі Яна Чачота;
- каларыт і арыгінальнасць падачы конкурснага матэрыялу.

## 5. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ І ЎЗНАГАРОДЖВАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ

5.1. Журы Конкурса вызначае пераможцаў першай, другой і трэцяй ступеняў і, пры наяўнасці бяспрэчнага лідэра, уладальніка гран-пры;

5.2. Пераможца глядацкіх сімпатый вызначыцца шляхам галасавання на афіцыйным сайце ДУК "Баранавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма", дзе ў перыяд з 1 па 5 ліпеня будуць размешчаны конкурсныя работы;

5.3. За дасягнутыя вынікі ўдзельнікі Конкурсу ўзнагароджваюцца адпаведнымі дыпломамі і падарункамі;

5.4. Вынікі Конкурсу будуць размешчаны на сайце ДУК "Баранавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма", на сайце газеты "Наш край" і ў сацыяльных сетках бібліятэкі.